— Памятаю, што апошні надрукаваны верш называецца "Вечны жыд", здаецца, у адным з веснавых нумароў "Крыніцы". А вось напамяць свае вершы ніколі не памятаю. Апошнія ж радкі выбітыя на помніку майго сябра Цыбульскага Валодзі з маёй вёскі. Ён скончыў факультэт фізічнага выхавання Магілёўскага педінстытута і памёр. Свядомы быў чалавек. Гэта, мабыць, адзіная эпітафія на беларускай мове ў Гомельскай вобласці.

Я чую з неба сум ваш на зямлі,
Вы не судзіце свайго сына строга,
Мяне анёлы за руку ўзялі
І, як дзіця, вядуць да Пана Бога,
Таму па мне не плачце, мама, многа,
Бо да Хрыста, нібы дамоў, дарога...

— На твой погляд, бываюць таленавітыя паэты абсалютнымі цвярознікамі, ціхонямі, нейкімі бязгрэшнымі, ідэальнымі бесцялеснымі фігурамі?

— Ганна, на мой капыл, не бываюць. Прынамсі, я такіх не сустракаў і не ведаю ў літаратуры. Хтосьці скажа: а Багдановіч? О, гэта яшчэ тая "мятущаяся душа"! А ў прынцыпе, бедны памёр, так і не паспеўшы зграшыць. Мабыць, зараз дзесьці ў раі.

— Ты быў адным са стваральнікаў літаратурнага аб'яднання "Тутэйшыя". Раскажы, калі ласка, падрабязней аб гэтым перыядзе.

— Ну добра, расказаў жа табе, адкуль узялася "Пагоня", тады раскажу, адкуль узяўся Беларускі народны фронт. БНФ, па вялікім рахунку, узяўся з "Талакі" і "Тутэйшых". Але гэтая размова не на адно інтэрв'ю. Я, дарэчы, знайшоў добрага журналіста, які быў і ў "Талацэ", і ў "Тутэйшых". Гэта ж такая гісторыя, цэлы раман. З працягам...

— Аб чым марыць сёння Анатоль Сыс?

— Здаецца, пра ўсе свае мары я ўжо сказаў. Паўтаруся: каб не было вайны, каб мы адзін аднаго не баяліся, паважалі, каб міліцыя ў мяне не зрывала бел-чырвона-белы значок з грудзей. Няхай яны носяць свой чырвона-зялёны. Я ж ім не забараняю. Ведаю, што кожны, хто нарадзіўся на гэтай зямлі, любіць яе па-свойму, але любіць шчыра, і нічога паганага ёй і яе людзям не жадае. Іншая справа — "час такі і век такі". Усё вернецца на "кругі свая".

— Калі чытачы змогуць пазнаёміцца з тваімі новымі вершамі?

— Калі прыйдзе непагадзь. Абяцаю, як пойдуць восеньскія дажджы — пачну пісаць. Чаго і вам жадаю! Да сустрэчы!

Гутарку вяла Ганна СОУСЬ.

Анатоль СЫС

Сэрца

1

Мне на сэрцы золатам
*вышывалі краты,**
кроў балюча крапала на маю душу
з голкі дыяментавай аж у тры караты —
вось якое дзіва я ў грудзях нашу.

А бывае, падаю з усяго размаху,
дык на сэрцы золатам
шэсць крыжоў звіняць
аб зямельку родную, быццам меч
аб плаху, —
ні віном, ні лекамі боль той не суняць.

Дзе ўпаду, каб ведаў я,
дык падклаў падушку б, —
але ж вочы-зоркі сочаць на бяду,
мабыць, цяжар кратаў
датуль насіць мушу,
пакуль у магілу-матку не ўпаду.

Мне на сэрцы золатам
лёс мой вышывалі,
нітак не хапіла на апошні прэнт,
а калі паўмёртвага мяне пакідалі —
уваткнулі ў сэрца голку-дыямент.

Можа, каму трэба залатая нітка,
голка з дыяменту, я вас папрашу,
калі вам няцяжка, калі вам нябрыдка —
выратуйце сэрца, вызвальце душу!

Гэта ж вельмі проста:
нітку — у клубочак,
голку — у скарбонку,
што ў крыві — дарма,
без віны ды боязі спіце сабе ўночы,
ну а вашым ворагам сніцца хай турма.

З матамі, вар'ятамі,
з сабакамі іклатымі,
ды пад аўтаматамі,
з залатымі кратамі

будзе
хай
яна!

2

*О, каб сэрца жураўлінае***
нашым ворагам даў Бог,
немаўлячае, нявіннае,
каб ад бедаў іх бярог!

Я прагледзеў бы ўсе вочы,
я б сачыў Птушыны Шлях,
ў кожнай зорцы-патарочы
пазнаваў бы жураўля,

маё б сэрца разам білася
з жураўліным праз сто слот,
сто разоў крывёй аблілася б,
каб адолець сто нягод,

наказаў бы братам, сёстрам:
як знясілены засну,
вырай каб вялі
па вёрстах
на маю вясну-красну,
па дыханні майго сэрца,
па сцяжынках маіх слёз
з воч, адталых азерцаў,
поўных раем да нябёс,

наказаў бы бацьку, маці:
вунь сыходзіць снег з палёў,
каб прыбралі чыста ў хаце,
як пачуюць жураўлёў,

наказаў бы любай жонцы:
як знясілены спачну,
каб па жураўліным сонцы
навучыла жыць дачку,
каб па жураўлінай поўні
навучыла сына жыць,
каб дамоў дарогу помніў,
праз клады яна ляжыць,
на кладах магіла таты,
ён калісьці напісаў
верш пра залатыя краты —
на касца найшла каса.

Шануй сэрца жураўлінае,
ідзі босы, як ты ёсць,
чыстай паднябеснай глінаю,
і даруе Ягамосць.

О, каб сэрца жураўлінае...

* Радок з верша А.Філіповіча.
** Радок з верша М.Купрэева.

Судовыя ўрокі

Дзікунства

Яна ўскочыла ў магазін, як маланка. Імгненна і нечакана. Валасы ўскудлачаны, у вачах — невыказны роспач. "Дзе ў вас тэлефон? Дзе тут тэлефон?" — усхвалявана пыталася ў прадаўцоў.

— Вунь там, — яны паказалі рукой і пацікавіліся: — А што здарылася?

— Трэба выклікаць "хуткую дапамогу" і міліцыю...

Хутка ўчастковы міліцыянер быў у магазіне. Ды высветліць сутнасць здарэння ніяк не мог. Жанчына была моцна ўзбуджана. З яе адрывістых фраз вынікала, что муж запрасіў дадому нейкага мужчыну і, відаць, забіў яго.

Міліцыянер і жанчына паспяшаліся да месца трагедыі. Але трапіць у кватэру не ўдавалася. Яна выскачыла з яе без ключоў. А на званкі і стук у дзверы ніхто не адгукаўся.

Участковы ўскарабкаўся на балкон і адтуль залез у кватэру. На дыване ён убачыў мужчыну, які моцна хроп. Яго кашуля была ў крыві. Разбудзіць не ўдалося. Моцна п'яны, ён толькі нешта мармытаў сабе пад нос. На кухні міліцыянер убачыў яшчэ аднаго мужчыну ў крыві. Яго галава і тулава былі пакалаты нажом і акрываўлены. Побач ляжалі спэцканыя крывёю малаток і нож. Участковы тэрмінова выклікаў аператыўную групу...

Што ж адбылося ў гэтай кватэры сярод белага дня?

Медыцынскія эксперты налічылі на целе забітага болей за дваццаць удараў нажом, восем — малатком і тры — відэльцам. Ад атрыманых траўм ён памёр на месцы здарэння. Следства, а затым і суд высветлілі даволі банальную і павучальную гісторыю. Справа была так...

Месяцы за два да гэтага Алег выпадкова сустрэўся на вуліцы з Мікалаем. Пазнаёміліся, купілі ў складчыну бутэльку. Выпілі і хуценька разбегліся.

Мужыкі яны даволі розныя. Алегу за сорак. Мае сярэднюю адукацыю. Ужо сядзеў на лаўцы падсудных. У 1990 годзе атрымаў два гады адсідкі. Вызвалены з месцаў пазбаўлення волі датэрмінова. Ды на правільны шлях не стаў. Паўторна быў узяты на ўлік як алкаголік. Нягледзячы на ўшчуванні і папярэджанні, працягваў жлукціць спіртное. А падвыпіўшы, вельмі лёгка заводзіўся і пускаў у ход кулакі.

Мікалай, па словах яго жонкі, таксама выпіваў. Але скандалаў не зацяваў. Па характару ён чалавек мяккі, гаваркі, з-за чаго мог у падпітку і сказануць што-небудзь лішняе.

Словам, адзінае, што іх звязвала, дык гэта выпіўка. Але я хацеў бы звярнуць увагу на супрацьлеглыя рысы іх характараў, якія ў дадзеным выпадку і адыгралі ракавую роль. Адзін "лёгка заводзіцца", а другі надта гаваркі, можа ляпнуць што-небудзь неўпапад. Менавіта такія, сустрэўшыся, рэдка разыходзяцца мірна. Можна толькі здзіўляцца, што іх першая сустрэча прайшла без бойкі. Магчыма таму, што абодва спяшаліся, асушылі бутэльку і разбегліся.

Другая сустрэча адбылася таксама выпадкова. Быў цёплы жнівеньскі дзень. Алег ішоў у магазін за бутэлькай. На вуліцы і сустрэў Мікалая, запрасіў да сябе дамоў.

— У мяне ж чацвёртая гадавіна вяселля, — паведаміў знаёмаму.

Жонка хуценька накрыла на стол на кухні, і яны ўтраіх прыселі, каб адзначыць "знамянальную" падзею. Выпілі бутэльку "Імперыяла". Камунікабельны госць пачаў настойліва падміргваць гаспадыні і не скупіцца на кампліменты. Затым працягнуў гаспадару грошы: "Скокні за бутэлькай". Калі за тым зачыніліся дзверы, завёў размову аб магчымай сустрэчы з "прыгажуняй".

У тэмпе асушылі другую, і госць зноў працягнуў гаспадару грошы, ужо на трэцюю бутэльку. Іх узяла Валянціна: "Я пайду". Алег пачуў у яе голасе штосьці незразумелае і пацікавіўся: "Чаму?" Яна адказала дыпламатычна, маўляў, лепей яму застацца з госцем, чым ёй. І пайшла. Але нават такая мяккая фармулёўка яе адказу "завяла" Алега. Насупіўшы бровы і пастукваючы пальцамі па сталу, ён уставіўся на Мікалая.

— Ты што, чапляўся да яе? — зло спытаў гаспадар.

Госцю б, бачачы, як чырванеюць і ўздрыгваюць шчокі ў Атэлы, змяніць бы тэму гаворкі альбо хоць бы змякчыць яе. Ды гаваркі Мікалай ужо ўвайшоў у ролю і працягваў гнуць сваё:

— Эх, будзь я маладзейшы хоць трошкі... Угаварыў бы тваю жонушку...

— Ды як ты можаш, гніда, так гаварыць?

— Можа, табе грошы патрэбны? Я дам. Толькі пакінь на гадзінку з жонушкай. Ну што, па руках?

І атрымаў удар кулаком па носе, затым другі... Госць паваліўся на падлогу, а Алег схапіў са стала нож. Ён біў і біў ім па шыі, тулаве, галаве... Затым пабег да кладоўкі, узяў малаток і ім... Пасля відэльцам...

Вярнулася з магазіна Валя. Кінуўшы позірк на кухню, ледзь не самлела. На падлозе ляжаў, не падаючы ніякіх прызнакаў жыцця, госць. А муж, абхапіўшы галаву рукамі, моўчкі сядзеў за сталом.

— Што ж ты нарабіў? І з-за чаго? Што тут здарылася? — ляпятала яна.

— Сама бачыш, — буркнуў муж у адказ.

Пазней следчаму і на судзе ён тлумачыў, што госць двойчы зняважыў яго. Першы раз, калі прапаноўваў грошы за тое, каб пакінуў яго "сам на сам" з жонкай, а другі — калі пагрозліва даказваў, што можа зрабіць з яго "шашлык, як з барашка". Сцярпець такое ён не змог.

Суд прыгаварыў забойцу да трынаццаці гадоў пазбаўлення волі.

А вось яшчэ адна крывавая гісторыя. Пётр вырашыў паехаць у Сібір на заробкі. Білет туды, як высветлілася, каштаваў вялікія грошы. Пачаў кумекаць, як бы раздабыць які льготны. Знаёмы звёў з Вячаславам, які паабяцаў падсабіць. Вырашылі "змачыць саракаградуснай" свае намеры. Пётр купіў пару бутэлек гарэлкі, і тройка накіравалася ў бытоўку станцыі "Мінск — Сартавальны". Выпілі, пагаманілі.

З размоў Пётр даведаўся, што Вячаслаў ужо двойчы сядзеў за так званыя карыслівыя злачынствы. Першы раз атрымаў тры гады, другі — тры з паловай. Вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі датэрмінова. Гэта насцярожвала. Але, з другога боку, толькі з такімі схільнасцямі чыгуначнік і мог пагадзіцца падсабіць падобным шляхам.

Праз час Пётр зноў працягнуў грошы. Вячаслаў пайшоў за новай порцыяй спіртнога. Калі ён вярнуўся, сабутэльнікі ўжо храпелі. Вячаслаў спрабаваў разбудзіць Пятра, які разлёгся на лаўцы каля стала. Але той не згаджаўся саставіць кампанію і толькі мармытаў нешта ў адказ і нібыта абазваў яго нейкім непрыгожым словам. Гэта яго моцна раззлавала. Ён хуценька сеў за стол і асушыў паўбутэлькі... Яго позірк спыніўся на сякеры, якая ляжала пад лаўкай. Ён раптам схапіў яе і некалькі разоў ударыў лязам па твары Пятра.

Следчыя і суддзі доўга не маглі зразумець, што падштурхнула Вячаслава на такі дзікі крок. Знаёмства з яго жыццём паказвае, што ён лёгка заводзіўся. А ўскіпеўшы, хапаў усё, што трапляла пад руку, і ішоў на "крыўдзіцеля". На гэты раз, на жаль, пад рукой аказалася сякера...

У гэтых дзвюх трагедыях, як ужо прыкмеціў уважлівы чытач, не толькі шмат жорсткасці і крыві, але і ёсць адна акалічнасць, якая аб'ядноўвае іх, — датэрміновае вызваленне злачынцаў з месцаў зняволення.

У свеце даўно адмовіліся ад датэрміновых рапартаў. І ў эканоміцы, і ў сферы выхавання. Бо пераканаліся, што нічога, акрамя трагедый, яны не прыносяць. У нас жа зноў, як і ў былыя камуністычныя часы, назіраецца паварот да гэтай заганнай практыкі. Выпускаецца нямала прадукцыі, якая асядае на складах альбо абменьваецца па бартэру на памідоры і арбузы. Затое паляпшаюцца паказчыкі ў рапартах. Прыведзеныя гісторыі, як бачым, высвечваюць тую бяду, якая можа грымнуць пасля бравурных рапартаў. Сядзелі б злачынцы ў турме — і не было б новых крывавых драм.

Ды хіба толькі дзве прыведзеныя гісторыі высвечваюць такі вывад? Падобных гісторый шмат. Вось яшчэ адна.

Уладзімір атрымаў пяць гадоў турмы і павінен быў яшчэ знаходзіцца ў турме. Але тут умяшаліся нейкія недарэчныя сілы. Ён быў датэрмінова вызвалены з-за кратаў па рашэнню раённага суда. З месца пазбаўлення волі асуджаны атрымаў станоўчую характарыстыку. Чым пры гэтым кіраваліся суддзі і работнікі турмы, аднаму Богу вядома. Відаць, спяшаліся адрапартаваць аб паспяховым перавыхаванні. Улады крытыкуюць за рост колькасці злачынстваў, жадаюць лепшых паказчыкаў. Ну дык і атрымлівайце.

Апынуўшыся на волі, Уладзімір з сябруком завітаў у госці да знаёмага. У таго быў ужо сусед. Разам распілі пару бутэлек гарэлкі. І тут Уладзімір раптам успыліў, пачаў біць гаспадара, які так гасцінна прыняў яго і частаваў. Нарэшце схапіў нож і ўдарыў ім у грудзі. Гаспадар імгненна паваліўся на падлогу. Сусед ад нечаканасці толькі і вымавіў: "За што?" Уладзімір павярнуўся да яго і імгненна нанёс удар нажом і яму ў грудзі. Той таксама імгненна асеў на падлогу.

На судзе доўга спрабавалі высветліць прычыну канфлікту, у выніку якога загінулі двое мужчын. Але безвынікова. Падсудны так і не змог успомніць, што ж такое непрыемнае сказаў яму гаспадар.

Андрэй РУСАКОВІЧ.

Божа, колькі ж у нас арыштаваных!

Так усклікнула адна жанчына, перагортваючы сёмы нумар бюлетэня "Беларускія ведамасці", які выдаецца ў Варшаве і распаўсюджваецца ў свеце сярод актывістаў міжнародных арганізацый і ўплывовых рухаў. Так, відаць, усклікне кожны, хто возьме яго ў рукі. Тут зафіксавана храналогія парушэнняў правоў чалавека, даецца спіс прозвішчаў затрыманых і асуджаных на Беларусі па палітычных матывах. Доўгі, вельмі доўгі гэты спіс. Толькі ў сакавіку гэтага года было затрымана і асуджана болей за 160 чалавек, у красавіку — каля 130. Толькі за два месяцы каля трохсот асуджаных.

За што? За ўдзел у маніфестацыі, за тое, што размаўляў на беларускай мове, нёс нацыянальны сцяг. Вось радкі з "Беларускіх ведамасцяў": "20 сакавіка затрыманы Алесь Казак за распаўсюджанне ўлётак, асуджаны Ленінскім райсудом на 8 сутак... 23 сакавіка пад час акцыі БНФ, прысвечанай незалежнасці Беларусі, затрыманы і асуджаны: Аляксей Адамовіч (76 год), Акрасцёнак — на 5 сутак, Байдакова — Плявака — пенсіянерка, 73 гады, суткі пратрымалі ў Фрунзенскім РАУСе, асуджана судом на штраф у 2 млн. 600 тыс. рублёў, што ў чатыры разы больш за яе пенсію. Суддзя Місунова С.Е., сведкі-міліцыянеры Залатар А.Р. і Чунін А.І.".

Так, у храналогіі фіксуюцца і суддзі, якія выносяць падобныя прыгаворы, і работнікі праваахоўных органаў, якія затрымліваюць, збіваюць дэманстрантаў і даюць пакаранні. Названы, у прыватнасці, суддзі Рыбакоў, Мялыгуй, Качанаў, Высоцкая, работнікі міліцыі Альшук, Трызна, Душкевіч, Завадскі, Адамовіч, Трафімюк і многія, многія іншыя.

Складальнікі чорнага беларускага летапісу спадзяюцца, што паслугачоў рэжыму чакае свой Нюрнбергскі працэс. Цяпер жа вельмі важна зафіксаваць усе падзеі і іх удзельнікаў і азнаёміць з фактамі сусветную грамадскасць.

Цяжка чытаць гэтыя спісы. Яны — яскравае сведчанне таго, што адская рэпрэсіўная машына на Беларусі ўжо запушчана. Вось факты з гэтага рэпрэсіўнага канвеера, прыведзеныя ў сёмым нумары бюлетэня "Беларускія ведамасці": "2 красавіка адбылося масавае шэсце і мітынг пратэсту супраць інтэграцыі Расіі і Беларусі, пасля чаго некалькі тысяч чалавек пайшлі да расійскага пасольства, дзе адбылося масавае збіванне дэманстрантаў. Затрымана каля 300 чалавек. Сярод іх: Мікола Ацыповіч — дацэнт політэхнічнай акадэміі, атрымаў чэрэпна-мазгавую траўму, Рычард Барысевіч — збіты, дастаўлены ў Цэнтральны РАУС [...], Павел Карназыцкі — атрымаў 10 сутак зняволення, збіты АМАПаўцамі ў аўтобусе пасля суда..."

Ігар КАВАЛЬЧУК.

Дайджест

От одного упоминания об экономике Ясер Арафат потерял сознание...

Новой угрозой шаткому мирному процессу на Ближнем Востоке может стать ухудшающееся здоровье главы Палестинской автономии Ясера Арафата, сообщает "Таймс". Как стало известно газете от надежных источников в египетском правительстве, в Каире во время дискуссии на встрече с министрами иностранных дел арабских стран Арафат потерял сознание и был эвакуирован из здания Министерства иностранных дел Египта. Согласно анонимному представителю египетского МИДа, Арафат потерял сознание во время бурного обсуждения вопроса о проведении конференции по проблемам экономики, в которой примет участие Израиль. По мнению "Таймс", ухудшающееся здоровье Ясера Арафата может оказать серьезное влияние на ближневосточный мирный процесс, ведь ни один из окружающих его соратников и близко не имеет той популярности и уважения, которыми пользуется Арафат среди палестинцев.

И США получают инвестиции... А Беларусь?

Объем инвестиций, сделанных развитыми странами в 1996 году, составил рекордную сумму — 349 миллиардов долларов, сообщает "Ассошиэйтед Пресс" со ссылкой на ежегодный доклад Конференции ООН по торговле и развитию. Крупнейшим инвестором и крупнейшим получателем инвестиций являются США. На их долю приходится 85 миллиардов долларов инвестиций. На втором месте идет Великобритания — 30 миллиардов долларов. Среди развивающихся стран первую строку занимает Китай. Он получил 40 миллиардов. Львиная доля инвестиций в странах Восточной Европы приходится на Польшу — 5 миллиардов долларов. Авторы доклада отмечают, что целью инвестиций является получение доступа к развивающимся рынкам, а не возможность использования дешевой рабочей силы.

Подготовила Светлана РОСТОВА.

Дзень у гісторыі

4 кастрычніка

У 1582 г. у каталіцкіх краінах па рашэнні папы рымскага Грыгорыя XIII уведзены **грыгарыянскі каляндар** (замест ранейшага юліянскага). Жыхары Рыма ляглі спаць 4 кастрычніка, а прачнуліся на наступны дзень 15 кастрычніка. Англія (пратэстанцкая) перайшла на новы каляндар у 1752 г., Расія, а разам з ёй і мы — у лютым 1918 г.

У 1801 г. пайшоў з жыцця **Уладзімір Іванавіч Даль,** рускі пісьменнік, лексікограф і этнограф, ганаровы член Пецярбургскай акадэміі навук. Па прафесіі ён быў ваенным урачом, але любіў і даследаваў побыт і мову рускага народа. Пісаў ён і этнаграфічныя нарысы ("Балгарка", "Палалянка", "Цыганка"), апрацоўваў казкі. 50 гадоў У.Даль працаваў над складаннем "Тлумачальнага слоўніка жывой вялікарускай мовы", у які ўвайшлі 200 тысяч слоў і 30 тысяч прыказак і прымавак. У слоўніку багата і беларускай народнай лексікі.

У 1929 г. выйшаў першы нумар масавай дзіцячай газеты **"Піянер Беларусі"**. Яна выходзіла адзін раз на тыдзень. Назва газеты правакуе параўнанні з "піянерамі Амерыкі": пэўнай частцы дарослых хацелася, каб дзеці гэтаксама "акупіравалі" і гвалтоўна "асвойвалі" землі сваіх бацькоў і дзядоў — спрадвечных тутэйшых жыхароў, якія жылі тут па сваіх законах і мелі сваю культуру (індзейцаў).

У 1942 г. пачалася карная аперацыя нямецка-фашысцкіх захопнікаў **"Рэгата"** супраць партызан і насельніцтва ў Горацкім і Дрыбінскім раёнах.

У 1957 г. у космас быў запушчаны першы ў свеце **штучны спадарожнік Зямлі**. Яго пазыўныя абвясцілі пачатак касмічнай эры ў гісторыі чалавецтва. Спадарожнік быў выведзены на арбіту з тэрыторыі СССР з дапамогай касмічнай ракетнай канструкцыі С.П.Каралёва.

5 кастрычніка

У 1713 г. нарадзіўся **Дэні Дзідро,** французскі філосаф-матэрыяліст, пісьменнік і тэарэтык мастацтва. У філасофіі ён прайшоў шлях ад дэізму да ваяўнічага матэрыялізму і атэізму. Дзідро адстойваў ідэі адзінства матэрыі і свядомасці, дабра і прыгажосці. У час наведвання Расіі (1773—1774 гг.) ён імкнуўся пераканаць Кацярыну II адмяніць прыгон і ажыццявіць прагрэсіўныя рэформы (але — дарэмна...). Ідэі Дзідро былі даволі папулярнымі ў Беларусі апошняй трэці XVIII ст., а знакамітая яго "Энцыклапедыя" была ў бібліятэках многіх нашых навучальных устаноў і ў прыватных калекцыях (дарэчы, М.К.Агінскі напісаў для яе артыкул "Арфа").

У 1733 г. каралём польскім і вялікім князем літоўскім выбраны **Аўгуст III,** курфюрст саксонскі, сын Аўгуста II Моцнага. Ён заняў гэты трон пры дапамозе рускіх і саксонскіх войскаў (разам з ім прэтэндаваў і Станіслаў Ляшчынскі). Аўгуст III не меў сваіх палітычных канцэпцый і кіраваў з дапамогай фаварытаў, таму за гады яго праўлення ў краіне пашыралася феадальная анархія, аднак, як прызнана (парадаксальна гэта ці не?), ажывіліся культурнае жыццё і эканоміка... Памёр Аўгуст III у сумную гадавіну свайго выбрання — 5 кастрычніка 1763 г.

У 1943 г. пачаліся баі партызанскага палка **"Трынаццаць"** супраць нямецка-фашысцкіх войскаў каля вёскі Боўкі Быхаўскага раёна і доўжыліся да 18 кастрычніка.

6 кастрычніка

У 1596 г. была прынята **Берасцейская царкоўная унія** — пагадненне пра аб'яднанне на тэрыторыі Рэчы Паспалітай праваслаўнай царквы з каталіцкай на ўмовах абавязковага прызнання вяршэнства папы рымскага і асноўных дагматаў каталіцтва. Богаслужэнне ў цэрквах павінна было весціся на роднай мове, а унікальнасць праваслаўных абрадаў — захаваная. Гэта быў дзень утварэння на Беларусі уніяцкай царквы.

У 1745 г. у Варшаве нарадзіўся **Францішак Смуглевіч,** жывапісец, графік і педагог. Ён вучыўся маляванню ў свайго бацькі, таксама мастака. Ф.Смуглевіч размалёўваў золатам гроты, выканаў шмат манументальных размалёвак у храмах Беларусі (Мінск, Гродна, Полацк), Літвы і Польшчы. Гэты мастак аформіў так званую залу Смуглевіча ў бібліятэцы Віленскага універсітэта (разам з братам Антоніем).

Старонкі храналогій гартаў Юльян ГРЫГАРОВІЧ.

4—11 кастрычніка

ШТО, ДЗЕ, КАЛІ?

■ ВЫСТАВЫ

Нацыянальны мастацкі музей прапануе пазнаёміцца з экспазіцыяй мастакоў суполкі "Віцебская акварэль". З *9 кастрычніка* тут пачне працаваць выстава памяці Хацановіч-Драбынян (габелен, акварэль).

У Палацы мастацтваў — экспазіцыя Беларускай акадэміі мастацтваў і выстава, прысвечаная памяці знакамітага беларускага мастака Альгерда Малішэўскага.

У Нацыянальным музеі гісторыі культуры Беларусі можна пабачыць выставу "Ля вытокаў беларускай археалогіі" і даведацца пра цяжкі лёс беларускіх археолагаў, рэпрэсіраваных у 1937 годзе, пазнаёміцца з іх працамі. Па заканчэнні выставы плануецца правесці навуковы семінар, дзе адбудзецца выніковая гутарка пра ролю выставы ў культурных стасунках паміж Польшчай і Беларуссю. Таксама тут працуе экспазіцыя "Старажытная беларуская геральдыка".

Па-ранейшаму ў музеі можна акунуцца ў свет "Казачных фантазій".

Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запрашае наведаць экспазіцыю, якая распавядае пра трагедыю беларускага народа ў перыяд фашысцкай акупацыі. Наведвальнікаў музея чакаюць дзве выставы: "Радавыя Перамогі" і "Светлая памяць". Першая прысвечана ваенным лёсам простых салдат, а другая экспануе творы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яшчэ ў музеі пачала працаваць экспазіцыя "Першыя ўзнагароды Вялікай Айчыннай вайны", прымеркаваная да 50-годдзя з дня заснавання першых медалёў і ордэнаў.

У Літаратурным музеі Янкі Купалы праходзіць літаратурная тэматычная вечарына "Беларусы ў Вільні", а таксама будуць падведзены вынікі Міжнароднага купалаўскага пленэру, што адбыўся сёлета ў маі — ліпені.

Музей гісторыі беларускай літаратуры зараз рыхтуе выставу, прысвечаную творчай дзейнасці Пімена Панчанкі. Пра час адкрыцця экспазіцыі наша газета паведаміць у наступных нумарах.

У мастацкай галерэі "Жыльбел" *(вул. Багдановіча, 9а)* праходзіць выстава экзатычных жывёл. Наведвальнікі выставы змогуць пазнаёміцца з суслікамі, рыссю, малпачкамі, чарапахамі Матамата, змеямі і іншымі экзатычнымі звярамі.

Галерэя "Мастацтва" *(пр-т Ф.Скарыны, 12)* запрашае пазнаёміцца з творамі Фелікса Янушкевіча.

Музей валуноў *(мікрараён "Уручча-2")* запрашае на экскурсію па валунах, сабраных з усёй тэрыторыі рэспублікі.

Галерэя "Верхні горад" *(пл. Свабоды, 5)* запрашае пазнаёміцца з творамі беларускіх мастакоў: Алега Скавародкі (Віцебск), Ігара Рымашэўскага, Леаніда Шчэмелёва, Мікалая Бушчыка, Яны Первяковай, Дзмітрыя Маслея, Дзмітрыя Зеньковіча, Ніны Голышавай, Эдуарда Багранцава, Валянціна Губарава і іншых. Таксама тут можна наведаць экспазіцыю мастака Алеся Сушы. Дарэчы, амаль усе творы, прадстаўленыя на выставе, можна набыць.

У Палацы культуры Мінскага трактарнага завода кожную нядзелю праходзіць кніжная выстава-кірмаш.

У Рэспубліканскім Доме тэхнічнай і мастацкай творчасці навучэнцкай моладзі *(вул. Славінскага, 12)* экспануецца больш за дзве тысячы твораў тэхнічнай і мастацкай творчасці беларускіх юнакоў і дзяўчат.

У музеі прыроды і экалогіі *(вул. К.Маркса, 12)* можна пазнаёміцца са светам жывёл Беларусі. Таксама тут працуе даволі экзатычная выстава "Чароўны свет матылькоў", дзе прадстаўлены дзённыя і начныя матылькі Еўропы, Азіі, Амерыкі.

У ВАЛОЖЫНЕ

Краязнаўчы музей запрашае пазнаёміцца з выставай "Птушкі Налібоцкага краю", падрыхтаванай з фондаў сталічнага музея прыроды і экалогіі.

У музеі сучаснай беларускай скульптуры імя Андрэя Бембеля экспануецца выстава твораў скульптара Анатоля Бачкарова (1942—1997).

■ КАНЦЭРТЫ

Сталічны цырк запрашае на адкрыццё сезона. У новай праграме "Усё гэта — цырк!" упершыню прымаюць удзел артысты беларускага і маскоўскага цыркаў.

У Палацы культуры чыгуначнікаў

4—5 кастрычніка — пройдуць гульні Вышэйшай лігі Беларускага клуба вясёлых і знаходлівых. У першы дзень гульняў паміж сабою будуць "высвятляць адносіны" каманды "Физмат и К" з Магілёва і "Горaздо" з Брэста, а ў другі — сустрэнуцца віцебскі "Симплесин" і "ЧП" з Мінска.

■ ТЭАТРЫ

Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы

4 кастрычніка — М.Рымскі-Корсакаў "Царская нявеста", опера ў чатырох дзеях.

5 кастрычніка — дзіцячы тэатр-студыя — Ц.Кюі "Кот у ботах", опера ў дзвюх дзеях.

7 кастрычніка — Дж.Вердзі "Рыгалета", опера ў трох дзеях.

9 кастрычніка — С.Картэс "Візіт дамы", опера ў дзвюх дзеях.

11 кастрычніка — П.Чайкоўскі "Яўген Анегін", опера ў трох дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр балета

5 кастрычніка — Ю.Глазуноў "Раймонда", балет у трох дзеях.

8 кастрычніка — А.Хачатуран "Спартак", балет у трох дзеях.

10 кастрычніка — А.Адан "Жызэль", балет у дзвюх дзеях.

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы

4 кастрычніка — "Паўлінка", "Лес". На Малой сцэне — "Смех лангусты".

5 кастрычніка — "Лес".

6 кастрычніка — "Ледзі Нявіннасць".

8 кастрычніка — **ПРЭМ'ЕРА!** "Касцюмер".

9 кастрычніка — "Ажаніцца — не журыцца".

10 кастрычніка — "Паўлінка".

11 кастрычніка — "Ромул Вялікі".

Мінскі драматычны тэатр "Дзе-Я?"

3, 4, 5 кастрычніка — адкрыццё сезона. **ПРЭМ'ЕРА!** "Распад" паводле твораў У.Шэкспіра. Таксама ў гэтыя дні пройдзе бенефіс мастацкага кіраўніка тэатра Міколы Трухана (яму не так даўно споўнілася 50 год). Дарэчы, у гэтым годзе тэатр "Дзе-Я?" адзначае дзесяцігоддзе з пачатку свайго шляху і пяць год у статусе тэатра драмы. Шчыра віншуем!!!

7, 8, 9 кастрычніка — **ПРЭМ'ЕРА!** Я.Шабан "Аўтограф на пласцінцы", драма.

10, 11 кастрычніка — **ПРЭМ'ЕРА!** М.Гогаль "Жаніцьба", камедыя.

11 кастрычніка — спецыяльна для маленькіх гледачоў казка-прыпавесць "Баранковы кароль".

Мінскі тэатр сатыры і гумару "Хрыстафор" *(у памяшканні Палаца культуры прафсаюзаў)*

3 кастрычніка — "Выбранае", лепшыя нумары, створаныя за апошнія дзесяць год.

4 кастрычніка — "Кавалеры приглашают дамов!", шансанье — Аляксандр Длускі.

5 кастрычніка — "Трэцім будзеш?", безалкагольныя пасядзелкі з гледачамі.

10 кастрычніка — "ЖЭНЕФІС" Яўгена Крыжаноўскага.

11 кастрычніка — "Ад Чыжоўкі да Камароўкі", культурна-гумарыстычнае мерапрыемства.

У Дзяржаўным тэатры музкамедыі

4 кастрычніка — "Марица".

5 кастрычніка — "Стойкий оловянный солдатик", а таксама — "Ночь в Венеции".

8 кастрычніка — "Принцесса цирка".

9 кастрычніка — "Летучая мышь".

10 кастрычніка — "Шахерезада", а таксама "Іспанскі дывертысмент".

11 кастрычніка — "Шляпа Наполеона".

У Дзяржаўным акадэмічным рускім драматычным тэатры імя М.Горкага — ТЫДЗЕНЬ СПЕКТАКЛЯЎ БАРЫСА ЛУЦЭНКІ, мастацкага кіраўніка тэатра, народнага артыста Беларусі.

7 кастрычніка — **ПРЭМ'ЕРА!** Я.Купала "Раскіданае гняздо", драматычная гісторыя.

8 кастрычніка — А.Дудараў "В сумерках", драма ў дзвюх частках.

9 кастрычніка — Д.Фо, Ф.Рамэ "Свободный брак", спектакль у дзвюх частках. На Малой сцэне — "Братья Моор", драма ў дзвюх частках.

10 кастрычніка — "Амфітрыён", інтымныя сцэны з жыцця людзей і багоў у дзвюх частках па матывах старажытных грэчаскіх міфаў, твораў Плаўта, Мальера, Клейста, Жыраду і Хакса.

11 кастрычніка — Д.Мережкоўскі "Хрыстос і Антыхрыст", трагедыя ў дзвюх частках.

Тэатр-лабараторыя "Вольная сцэна"

4, 11 кастрычніка — "Узлёт Артура Уі".

5 кастрычніка — "Заложніца кахання".

7 кастрычніка — "Шампань-Скага!"

8, 10 кастрычніка — "Паваліўся нехта".

9 кастрычніка — "Барбара Радзівіл".

Падрыхтавала Марына КОКТЫШ.

Кроссворд

Составила Маргарита МАМУЛОВА

По горизонтали: 5. Заместитель руководителя высшего учебного заведения. 8. Обратная сторона игральной карты. 9. Человечек из романа Дж.Свифта "Путешествие Гулливера". 12. Город на западе Ирана. 14. Жук семейства долгоносиков. 16. Устройство для подъема жидкости сжатым газом. 18. Воспаление коленного сустава. 20. Белое щелочное кристаллическое вещество. 21. Латышское мужское имя, День ангела — 4 ноября. 22. В Западной Европе в средневековье — слуга короля или феодала. 23. Изобретатель первой практически пригодной системы телеграфа. 25. Небольшой якорь. 26. Командная спортивная игра с мячом. 27. Эротический фильм, поставленный в 1976 году режиссером Д.Хамилтоном и А.Кольпи. 29. Один из первых режиссеров американского кино. 30. В Испании — титул принцесс. 31. Сорта вишни со светлыми плодами. 33. Древнее грузинское поселение, с XVI в. — на территории Турции. 34. Накладные металлические украшения переплета книги.

По вертикали: 1. Посевное травянистое растение, из семян которого изготавливают крупу. 2. Французский писатель (1898—1971), автор серии романов Буссардели. 3. Медицинская процедура. 4. Спортивная разновидность кеглей. 6. Упакованный багаж. 7. Старая русская мера жидкости, равная 1/16 ведра. 10. Прибор для непрерывной регистрации изменений магнитного поля Земли. 11. Сумбурное сочетание звуков. 13. В англосаксонском праве — письменное показание под присягой. 15. Самая маленькая птичка. 17. Наиболее удаленная точка орбиты спутника двойной звезды. 18. Композитор, автор балета "Шахсенем" (1925). 19. То же, что аукцион. 24. Искусство создания поделок из бумаги. 25. Отход свеклосахарного производства, содержащий известь. 28. Минерал, железный шпат. 29. Занавеска. 32. Растение, из корневищ отдельных видов которого получают фиалковый корень, применяемый в парфюмерии. 33. Штат на северо-западе Бразилии.

Ответы на кроссворд, опубликованный в № 171

По горизонтали: 5. Рекорд. 7. Венгры. 8. Варшава. 10. Срок. 11. Плут. 12. Драугисте. 15. Толки. 18. Гумно. 19. Словарь. 20. Штурмовщина. 22. Верлибр. 25. Нерис. 26. Весна. 29. Горбунков. 30. Лувр. 32. Веер. 33. Дурачье. 34. Сказка. 35. Разбег.

По вертикали: 1. Некрасов. 2. Волк. 3. Сноп. 4. Аргумент. 6. Дверь. 7. Вахта. 9. Шигаев. 13. Украшения. 14. Бухгалтер. 16. Кларнет. 17. Хрущобы. 21. Веснушки. 23. Летува. 24. Иноземец. 27. Фонда. 28. Позер. 31. Роза. 32. Вязь.

Спорт

А победа была так близка

Кубок УЕФА 1/32 финала

Динамо (Грузия) — МПКЦ (Мозырь, Беларусь): 1:0

В победе грузинских футболистов в ответном матче мало кто сомневался. Однако в первом тайме тбилисские динамовцы хоть и полностью контролировали мяч, но создать что-нибудь опасное у ворот МПКЦ не смогли.

В перерыве тренер "Динамо" Давид Кипиани объяснил своим игрокам, что так дело не пойдет, и, вслушавшись в слова тренера, грузины с первых минут второго тайма ускорили, взвинтив, темп. Это принесло свои плоды уже на 48-й минуте, когда Денисюк сбил в своей штрафной Кикнадзе. Пенальти... Но сильный удар Гогигайшвили парировал вратарь мозырян Гаев.

Тбилисцы не отчаивались и продолжали атаковать. Однако на 56-й минуте одна из единственных атак белорусов могла завершиться голом. Денисюк, пробивая штрафной, угодил в перекладину. А грузины , несмотря на это, упорно продолжали штурмовать ворота Гаева. И на 71-й минуте все же добились своего. Вышедший на замену Алексидзе мощным ударом из-за пределов штрафной забил мяч в ворота МПКЦ.

Со счетом 1:0, не в нашу пользу, матч так и завершился. В итоге по сумме двух встреч в следующий раунд Кубка УЕФА вышло тбилисское "Динамо". А футболистам МПКЦ предстоит еще многому научиться.

Алексей ЖУРАВЕЛЬ.

Хочаце — верце, хочаце — не верце

Будучы тыдзень: зоркі прадказваюць

Авенам (21 сакавіка — 20 красавіка) — паспяховае вырашэнне сямейных канфліктаў. Верагодна, атрымаеце мноства цікавых прапаноў. Стабільнасць у бізнесе, як мяркуюць зоркі, не будзе выклікаць ніякіх сумненняў. Не выключана, што тыдзень скончыцца невялікім расчараваннем на працы. Не памыліцеся, калі прысвяціце свой вольны час важным, у тым ліку фінансавым пытанням. Напрыканцы тыдня не выключаны зусім нечаканы паварот падзей вам на карысць. Варта звярнуць увагу на самаадчуванне блізкіх вам людзей. Дарэчы, каб паспець вырашыць усе пытанні, планеты раяць больш прадумана планаваць свой час.

Цяльцам (21 красавіка — 21 мая) — пераезды і змены ў асабістым жыцці. Верагодна, нечакана атрымаеце вялікія грошы ці падпішаце выгадны кантракт. Дарэчы, на гэтым тыдні зоркі раяць распачаць работу над ажыццяўленнем даўняга дзелавога праекта, які абяцае фінансавае працвітанне, але толькі на час. Не выключана, што вам пашчасціць з уладкаваннем сардэчных спраў — з'явіцца магчымасць завязаць пяшчотны раман ці з галавой акунуцца ў рамантыку прыгод. Увогуле, тыдзень парадуе вас сваімі вынікамі. Не выключана, што на гэтым тыдні вы знойдзеце сябе ў рабоце і згубіце ў каханні. Дарэчы, як сцвярджаюць зоркі, выпадковая сітуацыя запатрабуе ад вас максімальнай халоднасці розуму і бесстароннасці ў ацэнках.

Блізнятам (22 мая — 21 чэрвеня) — капрызы. Добры перыяд для стажыровак, вышуку сувязяў з аўтарытэтнымі асобамі. Верагодныя сутыкненні з кіраўніцтвам. Зоркі раяць стрымліваць свае эмоцыі. Спрыяльны час для сустрэч з каханым чалавекам. Не варта кідацца з галавой у возера задавальненняў — гэта можа дрэнна адбіцца на сямейных адносінах. Планеты сцвярджаюць, што вашай нярвовай сістэме напрыканцы тыдня запатрабуецца невялікі адпачынак. Не раяць планеты ў сярэдзіне тыдня шукаць на сваю галаву прыгод кахання. Таксама вам прыйдзецца абмежаваць сябе ад паездак — гэта можа адабраць у вас шмат сіл і выбіць з працоўнага рытму.

Ракам (22 чэрвеня — 23 ліпеня) — заклапочанасць. Зоркі рэкамендуюць уважліва аднесціся да калег па працы. Не выключана напрыканцы тыдня канфліктная сітуацыя. Мабыць, пры пэўных нервовых затратах у вас нарэшце на нейкі час вырашацца фінансавыя пытанні. Планеты раяць час ад часу стрымліваць свае эмоцыі: халодны розум — лепшы дарадчык амаль ва ўсіх небяспечных сітуацыях. Калі не страціце рашучасці ў дзеяннях і бліснеце выдатнай дзелавой хваткай, верагодна, дасягнеце добрых вынікаў і ўсеагульнага прызнання. Не паддавайцеся на правакацыі — усё гэта адны словы.

Львам (24 ліпеня — 23 жніўня) — неверагодныя здарэнні. Добры перыяд для вырашэння фінансавых пытанняў. Зоркі раяць адразу браць быка за рогі. Не чакайце, пакуль гэтая жывёліна схопіць вас за горла. Менавіта тады, мабыць, поспех пастукае вам у дзверы і вы адчуеце, што здольныя зрушыць горы. Весткі, якія атрымаеце ў аўторак, так закруцяць падзеі ў сераду, што ў чацвер, верагодна, прыйдзецца звярнуцца па дапамогу сяброў. Як сцвярджаюць планеты, тыдзень запомніцца сустрэчай, сур'ёзнай размовай з каханым чалавекам, плёткамі і прагулкай па Батанічнаму саду.

Дзевам (24 жніўня — 23 верасня) — нечаканы падарунак. Магчыма, у вас чакаюцца значныя расходы. Адпаведна прыйдзецца інтэлектуальна папрацаваць, каб выправіць сітуацыю, што склалася. Затое, сцвярджаюць планеты, праяўленыя пры гэтым знаходлівасць і працаздольнасць пазбавяць вашых нядобразычліўцаў магчымасці пазлараднічаць. Другая палова тыдня можа быць зусім не такой спакойнай, як вы таго чакаеце. Але пры правільным выбары паводзін клопатаў удасца паспяхова пазбегнуць. Мабыць, тыдзень запомніцца дробнымі пакупкамі, сяброўскімі сустрэчамі і падарункам ад каханага чалавека.

Шалям (24 верасня — 23 кастрычніка) — фінансавыя паступленні. Зоркі не раяць вам згаджацца на гэтым тыдні на справы, якія ў будучым не прынясуць вам неадкладнага прыбытку. Тым, хто распачаў новую справу, не выключана, трэба будзе нямала папрацаваць, каб атрымаць станоўчыя вынікі. Таксама планеты не рэкамендуюць вам засмучацца, а раяць ісці наперад, паколькі пасля ўсіх гэтых складанасцяў удасца нармалізаваць становішча і ўзяць яго пад свой кантроль. Пазбягайце на гэтым тыдні канфліктаў з членамі вашай сям'і, а на выхадныя пастарайцеся пры адпаведнай магчымасці выехаць на адпачынак за горад. Не выключана, што трапіце ў поле зроку добрага сябра, які з лёгкасцю спакусіць вас туманнымі далямі і далёкімі гарызонтамі. Галоўнае — у панядзелак не выпусціць пар у асабістым доме і не сапсаваць адносіны з блізкімі людзьмі.

Скарпіёнам (24 кастрычніка — 22 лістапада) — штодзённыя клопаты. Не выключана, што ў хуткім часе вам давядзецца атрымаць весткі ад сваіх кампаньёнаў аб заключэнні даволі выгаднай здзелкі. Аднак не варта празмерна радавацца гэтаму: на шляху да поспеху і ажыццяўлення сваіх мараў, паводле прагнозаў астролагаў, могуць узнікнуць даволі сур'ёзныя цяжкасці. Рызмяшчэнне нябесных свяціл вельмі паспрыяе навучэнцкай моладзі: студэнты і абітурыенты практычна зусім не адчуюць стрэсавых сітуацый. Для закаханых барометр абяцае "сонечнае надвор'е". Дзеля таго, каб пазбегнуць пастак і інтрыг, вам прыйдзецца даволі ўмела лавіраваць і праяўляць свае дыпламатычныя здольнасці.

Стральцам (23 лістапада — 21 снежня) — натхненне. Верагодна, астынеце да работы і адчуеце расчараванне літаральна ва ўсіх сваіх пачыннаннях. Такое становішча, сцвярджаюць зоркі, толькі ўскладніць вашы справы. Аднак усё не так дрэнна, як вам уяўляецца. Сваякі дапамогуць пераадолець стрэс, а адпачынак на прыродзе адцягне ад цяжкіх думак. Вашы праціўнікі, сцвярджаюць планеты, будуць абавязкова звергнуты, але для перамогі над імі вам неабходныя спакой, цярплівасць і дакладны разлік. На гэтым тыдні ў вас, верагодна, будзе бясконцая колькасць сустрэч, невялікіх паездак і тэлефонных размоў.

Казярогам (22 снежня — 20 студзеня) — сумненні. Не рэкамендуюць на гэтым тыдні зоркі траціць налева і направа грошы — стварыце маленькі рэзерв. Мабыць, ён хутка спатрэбіцца. У справах сардэчных прадбачыцца нечакана прыемнае здарэнне, і калі вы ўжо зрабілі свой выбар, то вам патрэбна быць асабліва ўважлівым у праявах сваіх пачуццяў. Памятайце: давярай, аднак правярай. Планеты не раяць адмаўляць сабе ў жаданні рабіць усе справы ўпарта і рашуча. Ёсць толькі адна ўмова — не вельмі моцна дзейнічайце лакцямі...

Вадалеям (21 студзеня — 19 лютага) — радаснае паведамленне, не выключаны грашовыя паступленні. Нягледзячы на амаль поўную адсутнасць за апошні час хваляванняў, на гэтым тыдні прыйдзецца прыкласці максімум старання ў рэалізацыі сваіх планаў і нават выкласці некаторыя казырныя карты. Зоркі раяць паспадзявацца на сяброў і свой інстынкт бізнесмена. Напрыканцы тыдня вас чакае сюрпрыз у асабістым жыцці. Аднак не губляйце галаву —- яна вам яшчэ не раз спатрэбіцца.

Рыбам (20 лютага — 20 сакавіка) — час змяніць рытм жыцця. Зоркі не раяць выношваць планы помсты ці на ўсялякі выпадак трымаць камень за пазухай — дрэнны мір лепшы за добрую спрэчку. Пазбягайце на гэтым тыдні азартных гульняў і грашовых аперацый. Не варта пераацэньваць меркаванне выпадковых знаёмых. Зоркі раяць заўважаць усялякія, нават дробныя вартасці навакольных. Дарэчы, ці не занадта вы кансерватыўны чалавек?

ТЕЛЕПРОГРАММА

Суббота, 4 октября

Белорусское телевидение

15.00 Новости.
15.15 Телеспорт.
16.00 Авторский концерт композитора Леонида Захлевного. Часть 2-я.
16.50 "Риск-версия". Телеигра.
17.20 Белорусский дом.
17.50 Галерея. Писатель-юморист Владимир Перцов (г. Несвиж). Авторская программа Татьяны Егоровой.
18.20 Выступление Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко на I съезде учителей Беларуси.
19.20 "Поздравляем!" Концерт для участников I съезда учителей Беларуси.
20.20 История любви. Владимир и Нина Липские.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.50 Теленавигатор.
22.10 Худ. фильм "Амадей". Часть 1-я (США).
23.30 Третий тайм.
23.50 Видимо-невидимо.

ОРТ

14.00 Новости.
14.20 "Моя семья: гражданский брак".
15.00 "Союзмультфильм" представляет... "Возвращение блудного попугая", "Ну, погоди!"
15.50 В мире животных.
16.30 Премьера Первого канала. "Как это было". Конец Пражской весны.
17.15 "Джентльмен-шоу".
17.45 Погода.
17.55 Комиссар Каттани в сериале "Спрут". 1-я серия.
19.00 Премьера Первого канала. "Эти забавные животные".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 Программа передач.
20.55 Погода.
21.00 Премьера Первого канала. Ерёменко — отец и сын в боевике "Сын за отца".
22.30 Мы — первые!
22.50 Фильм Стенли Кубрика "Космическая Одиссея: 2001".
1.15 Программа передач.

Канал "Россия"

13.00, 19.00 Вести.
13.20 Телескоп.
13.50 Ваш партнер.
14.05 Книжная лавка.
14.30 У всех на устах.
14.55 Московская панорама.
15.00 Док. экран. "Это Москва".
15.25 Бесконечное путешествие.
15.55 Футбол. "Динамо" (Москва) — "Шинник" (Ярославль). В перерыве — Вести про...
17.55 Старая квартира. Год 1956. Часть 2-я.
19.35 Репортер.
20.10 "Женщина в белом". Телесериал (Великобритания). 5-я серия.
21.15 "Городок". Развлекательная программа.
21.50 "Бартон Финк". Худ. фильм (США).
23.55 Любовь с первого взгляда.
0.30 Тихий дом. Программа С.Шолохова.
1.00 Живая коллекция.

Санкт-Петербург

15.30, 18.30 Информ ТВ.
14.35 Игра "Лотто-бинго".
15.45 Спортивное обозрение.
16.05 Театральная провинция?..
16.35 Детское ТВ. "Танцующий мир".
16.55 Равняется любовь.
17.25 Телемагазин.
18.55 Большой фестиваль.
19.15 Музыкальный ринг. Новое поколение.
20.50 Блеф-клуб.
21.30 Светская хроника.
21.45 Звездный розыгрыш.
22.15 "Четвертая планета". Худ. фильм (Россия).

НТВ

11.00, 15.00 Сегодня днем.
11.15 "Панорама" с Всеволодом Овчинниковым.
11.45 Криминал. Чистосердечное признание.
12.00 Хоккей. Матчи НХЛ. "Ванкувер Кэнакс" — "Анахайм Майти Дакс".
14.30 Сериал "Каролина в Нью-Йорке" (США).
15.15 Звезды в квадрате, или Проще простого.
16.00 Сериал "Саванна" (США).
17.00 Дог-шоу. Я и моя собака.
17.30 Герой дня без галстука.
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.30 Криминальная драма "Героин" (США).
20.45 Куклы.
21.45 Сериал. "Байки из склепа" (США).
22.15 "Кнопка плюс".
22.30 "Футбольный клуб" представляет чемпионат России. 30-й тур.
23.20 "Про это". Ток-шоу.
24.00 Ночной канал. "Плейбой-шоу".

ТВ-6 Москва

22.50 Шесть новостей.
0.15 Диск-канал.
24.00 Дорожный патруль.
17.15 Ералаш.
14.45 Ток-шоу "Профессия": "Конник".
15.40 Клуб одиноких сердец.
16.15 Сериал "Прекрасные господа из Буа-Доре".
17.30 Те Кто.
17.55 Ток-шоу "Мое кино" с Александром Олейниковым.
18.40 Премьера произведения Кшиштофа Пендерецкого.
19.25 Скандалы недели.
20.00 Программа "ОСП-студия".
20.50 Киножурнал "Фитиль".
21.05 Боевик "Киборг".
23.05 Шоу "Обоз".
1.20 Триллер "Проклятый".

8-й канал

15.00 Джойс Майер "Жизнь в огне".
15.30 Мульт-планета.
16.00 Программа "Кинематограф мести".
17.30 Сериал "Ришелье".
20.30 Вечарніца.
20.30 Сериал "Лабиринты любви".
21.30 Суперзвезды Голливуда.
22.00 Худ. фильм "Джованни Фальконе".

Воскресенье, 5 октября

Белорусское телевидение

8.00 "Коктейль по воскресеньям".
9.05 "Телебом". Шоу-конкурс.
9.35 "Мультиклуб". Международный анимационный фестиваль "Крок". Часть 1-я.
10.05 Вершина мира. Телевикторина.
10.40 "Все нормально, мама!" Развлекательная программа.
11.15 Туробъектив.
11.35 Арсенал. Программа для армейцев.
12.10 К Дню учителя. "Накануне будущего".
12.30 Вселенная. Космонавтике — 40 лет.
13.00 Сельчане. Встреча с крестьянами Польшы.
13.30 Сущность. Духовная программа.
14.05 К Дню учителя. Республиканский конкурс на лучшего учителя года "Хрустальный журавль".
14.35 Компьютерный полигон.
15.00 Новости.
15.15 Телек-шоу.
15.30 "Оскар". Телеигра.
16.00 Гандбол.Кубок европейских чемпионов. СКА (Минск) — "Црвена звезда" (Югославия). В перерыве — "Олимп".
17.25 Худ. фильм "Доживем до понедельника".
19.10 Бездельник.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Спортивный телекурьер.
21.10 Телебарометр.
21.25 Ток-шоу "Карамболь" с участием группы "АукцЫон".
22.00 Худ. фильм "Амадей". Часть 2-я (США).
23.20 Бархатный сезон.

ОРТ

6.35 Сергей Юрский, Павел Луспекаев и Мамочка в фильме "Республика ШКИД".
8.15 Мультфейерверк: "Приключения Вуди и его друзей", "Розовая пантера".
8.55 Спортлото.
9.00, 14.00, 23.20 Новости.
9.10 "Непутевые заметки" Дм.Крылова.
9.30 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
11.00 "Служу России!"
11.30 "Играй, гармонь любимая!"
12.00 Сельский час. Тележурнал.
12.30 Сериал "Подводная одиссея команды Кусто". "Тлеющее море".
13.20 Смехопанорама. Ведущий — Е.Петросян.
14.20 Клуб путешественников.
15.05 Футбольное обозрение.
15.35 Большой мультфильм. "Том и Джерри. Кино".
16.55 Леонид Якубович в телеигре "Колесо истории".
17.35 ОРТ и "звезды" эстрады против видеопиратства.
18.05 Погода.
18.15 "Золотая серия". Знаменитая комедия "Большие гонки". 1-я серия .
19.50 Киноафиша.
20.00 Время.
20.35 Программа передач.
20.40 "Большие гонки". 2-я серия.
21.45 Юбилей на Таганке. Любимову — 80.
23.30 Вера и Имре Кальман в программе "Приглашение к музыке".
0.00 Детектив "По данным уголовного розыска...".
1.15 Программа передач.

Канал "Россия"

6.00 Утренний экспресс.
6.55 "Фрам — полярный медведь". Телесериал(Румыния). 4-я серия.
7.50 Мультфильм.
8.00 "Когда открывается небо". Док. фильм.
8.30 Присяга.
9.00 Доброе утро, страна!
9.45 Компьютер.
10.00 Вести в одиннадцать.
10.25 Русское лото.
11.05 Пульс.
11.30 Новая Россия.
11.45 Люди, деньги...
12.10 Двойной портрет.
12.40 "Грот в Кусково". Видеофильм.
13.00 Вести.
13.20 "Танцующие призраки". Худ. фильм.
